ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.33 (3249) ● ЧАЦВЕР, 1 ВЕРАСНЯ, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Водар ягадных ласункаў
На традыцыйным свяце Вішнёвага пірага гучалі беларускія песні
Стар. 2

Сведка даўніх дзён
У рацэ Дрысе знайшлі ўнікальную скульптуру Стар. 3

Добрыя жарты Аляксандра Каршакевіча
Вядомы мастак, майстар сяброўскіх шаржаў з альманаха “Вожык” на Дні беларускага пісьменства ў Ганцавічах будзе раздаваць незвычайныя аўтографы Стар. 4

У чыстых далонях Нарачы

Узбярэжжа самага вялікага возера краіны, якое называюць беларускай пярлінай, пераўтвараецца ў элітны курорт. У мястэчку Нарач адкрыўся трохзоркавы гатэль з еўрапейскім узроўнем камфорту, а па возеры зноў, як і раней, ладзяцца прагулкі на цеплаходзе.

У гатэлі “Нарач” — еўрапейскі камфорт

Іна Ганчаровіч

Адпачываць на Нарачы — адна асалода, і многія аднаўляюць сілы пры возеры з чысцюткай вадой і адметнымі краявідамі. А гадоў за пяць на нарачанскіх берагах будзе створаны курорт сусветнага класа — такое рашэнне прынята летась. Варта нагадаць, што возера з-за адметнага абрысу на карце рамантычна называюць блакітным сэрцам Беларусі, а за чысціню і празрыстасць вады — беларускім Балатонам. Эколагі пацвярджаюць: гэта ўнікальны водны аб’ект, ён “нарадзіўся”, калі адступіў апошні ледавік. У адным з паданняў пра назву возера згадваецца прыгожая дзяўчына з рэдкім арабскім імем Нара (у перакладзе: светлая). Яна любіла сядзець ля вады і спяваць пад гуслі. Звонкі голас яе чуўся па ўзбярэжжы, зачароўваў і радаваў людзей. Аднойчы спевы пачуў стары пан, пажадаў ажаніцца з Нарай, ды яна адмовілася, а пад час пагоні ўцякачка кінулася ў ваду — і больш ніхто яе не бачыў. Людзі ж у гонар дзяўчыны і назвалі Нарачу самае вялікае і прыгожае возера тых месцаў.

БЕЛТА

Ціхая прыгажосць нарачанскіх краявідаў вельмі прывабная

Чыстая цёплая вада, маляўнічыя пейзажы, велізарная колькасць мінеральных крыніц, мяккі клімат, малыя вёскі і старыя гарады, якія зберагаюць таямнічыя знакі мінуўшчыны, — усё гэта даўно вабіць да Нарачы як беларускіх, так і замежных турыстаў. Ды вялікая плынь неарганізаваных аматараў адпачынку прыносіла да возера і нямала экапраблем. У 1999 годзе для таго, каб зберагчы і для нашчадкаў куток унікальнай прыроды Паазер'я, там створаны Нацыянальны парк “Нарачанскі”.

Цяпер на тэрыторыі парку абсталявана 15 стаянак для турыстаў — не толькі на ўзбярэжжы Нарачы, але і на берагах не менш прывабных азёр Мястра, Воўчына, Свір, Балдук. У такіх месцах заўсёды сустрэнеш беларусаў, ды яшчэ і са сваякамі, гасцямі з Расіі, Літвы, Украіны. “Да нядаўняга часу мы не арыентаваліся на прыём турыстаў з далёкага замежжа, — удакладніла кіраўнік аддзела турызму Нацпарку Людміла Краўчонак. — У нас было толькі пяць гасцявых дамкоў — прытулак для дзесяці чалавек”. Ды і тыя, зазначым, займалі найчасцей арнітолагі з Германіі, яны штогод прыязджаюць на Нарач для навуковых доследаў. Сёлета ж у сярэдзіне жніўня ў мястэчку Нарач прыняў першых гасцей трохзоркавы гатэль на 99 месцаў. Да берага возера — паўтары сотні метраў, нумары на адно і два месцы, яны розных узроўняў камфорту. Яшчэ два гатэлі і аквапарк маюць намер узвесці беларускія бізнесмены ў хуткім часе. “Ужо сёння мы гатовы задаволіць любыя запатрабаванні турыстаў: і тых, хто жадае “збегчы ад цывілізацыі”, і аматараў адпачынку з дыскатэкамі і боўлінгам”, — сцвярджае Людміла Краўчонак.

Так, дзякуючы рэалізацыі Дзяржпраграмы развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна на 2011-2015 гады, прынятай летась, адкрываюцца новыя турмаршруты, ствараюцца экскурсійныя праграмы. А па возеры цяпер можна падарожнічаць на невялікім цеплаходзе . У 70-х, дарэчы, па Нарачы ўжо хадзілі тры прагулачныя цеплаходы. І вось сёлета ў канцы ліпеня падаў першы гудок “Пасейдон”, цеплаход невялікі, усяго на 19 месцаў, і таму, як гаворыць Л. Краўчонак, на ім “заўсёды аншлаг”. Палюбавацца краявідамі з палубы на Нарач прыязджаюць з розных месц Беларусі. Для некага прагулка на цеплаходзе — як шчымлівае вяртанне ў пару маладосці.

Між іншым, не толькі чысціня і прыгажосць Нарачы, але і багатая гісторыя наваколля цікавіць турыстаў. Гісторыкам, скажам, вядома парадаксальнае паняцце “Нарачанская бітва за Парыж”. Аказваецца, пад час Першай сусветнай вайны менавіта ў крывавай бітве ля возера Нарач вырашаўся... далейшы лёс Францыі. І па гэты час там захаваліся вайсковыя ўмацаванні. Зрэшты, і нядаўняя знаходка дайверамі загадкавага судна на дне возера сведчыць: у Нарачы яшчэ шмат таямніц.

ДАРОГІ І ЛЁСЫ

Ашмяншчына: шляхі турыстычныя

Адам Мальдзіс

У госці на Ашмяншчыну мяне запрасіла дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ад Ашмянскай выбарчай акругі Валянціна Лузіна, а спадарожнікам стаў гендырэктар фірмы “Інвест-М” Іосіф Цімкоўскі. Неяк сонечным ранкам і павёў нас на паўночны захад ад беларускай сталіцы так званы Віленскі шлях. Пішу “так званы”, бо з шляхам гістарычным пад той жа назвай цяперашні мае мала агульнага: ранейшы, традыцыйны, па якім праязджалі дзясяткі відных дзеячаў беларускай і сусветнай культуры, вёў праз Радашкавічы і Маладзечна, Смаргонь і Жупраны. Новы ж, цяперашні, ляціць стралою, абмінаючы населеныя пункты. Гадзіны праз паўтары паказаліся вышынныя сілуэты Ашмян — іх касцёл і царква.

— Глядзіце, як блізка стаяць яны паміж сабой, — рэагуе на гарадскія вертыкалі Іосіф Цімкоўскі. — Думаю, у некаторых еўрапейскіх гарадах гэта выклікала б здзіўленне.

— І выклікае, — адказваю. — Беларусь традыцыйна славілася сваёй талерантнасцю. Памятаю, у свой час з ленінградскім навукоўцам Валянцінам Грыцкевічам мы пісалі кніжку “Шляхі вялі праз Беларусь”. Шляхі тыя — нямецкіх, аўстрыйскіх, французскіх, англійскіх дыпламатаў, навукоўцаў, падарожнікаў (сёння мы назвалі б іх турыстамі), што ехалі ў Масковію ці з яе і пакінулі пра падарожжы ўспаміны. На радзіме тых вандроўнікаў грымелі тады крывавыя Варфаламееўскія ночы, а на нашых землях за адным “гаспадарскім” сталом сядалі дружна побач святары праваслаўныя, каталіцкія, пратэстанцкія, мусульманскія, іудзейскія. → Стар. 3

БЕЛТА

На конях — у даўніну

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

Гучны гоман чутны ў грамадзе

Карына Аляксандрава

Колькі часу трэба суполцы, каб зацвердзіцца, зарэкамендаваць сябе цікавымі справамі, арыгінальнымі пачынаннямі? Пра "Беларускіх сяброў" у Грузіі, напрыклад, усяго праз год пасля стварэння нацыянальнага аб'яднання даведаліся не толькі ў гэтай краіне, але і далёка за яе межамі.

На працягу года суайчыннікі наладжвалі сувязі з этнічнай радзімай. Усталявалі кантакты з міністэрствамі культуры і адукацыі Беларусі. Адтуль у суполку перададзена шмат кніг беларускіх пісьменнікаў, фільмы пра краіну, яе прыроду, абрадавыя святы, а таксама метадычныя матэрыялы для правядзення канцэртаў і тэматычных вечароў, нотная бібліятэка музычных твораў, падручнікі па беларускай мове і літаратуры. У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце нават распрацавалі план супрацоўніцтва з землякамі ў Грузіі.

За год "Беларускія сябры" прынялі ўдзел у свяце дыяспар, прысвечаным Дню славянскага пісьменства, адзначылі ў Тбілісі Дзень незалежнасці Беларусі. "Мы былі прыемна здзіўлены той цікавасцю, з якой гледачы сустракалі нашы выступленні, — расказвае старшыня праўлення Саюза беларусаў Грузіі "Беларускія сябры" Аляксандр Жыляеў. — Інфармацыя пра канцэрты прайшла па многіх тэлеканалах Грузіі і ў праграме тэлеканала "Мир". З намі пачалі супрацоўнічаць многія грузінскія пісьменнікі, рэжысёры і музыкі. Яны ўдзельнічаюць у тэматычных вечарынах, перакладаюць вершы беларускіх паэтаў на грузінскую мову".

У планах "Беларускіх сяброў" — лекцыі па беларускай гісторыі і культуры, выставы твораў беларускіх мастакоў, стварэнне беларускай нядзельнай школы, а таксама фальклорных калектываў і тэатральнай трупы.

Саюз беларусаў Грузіі "Беларускія сябры"
Кіраўнік — Аляксандр Жыляеў
www.trrc.ge
E-mail: syabry.in.georgia@gmail.com

З творчасцю тальяцінскіх беларусаў пазнаёміліся госці Вішнёвага фэсту ў расійскай вёсцы Шыраева

Водар ягадных ласункаў

Кацярына Мядзведская

На традыцыйным свяце Вішнёвага пірага ў вёсцы Шыраева, што ў Самарскай вобласці Расіі, гучалі беларускія песні ў выкананні артыстаў тальяцінскага ансамбля "Купалінка"

Свята праходзіла ўжо ў пяты раз. Наогул фестываль вельмі папулярны сярод вяскоўцаў, на яго прыязджае заўсёды шмат гасцей з усёй вобласці.

Дзень Вішнёвага пірага — гэта толькі адно свята з шэрагу "ягадных" сустрэч. У Шыраеве праводзяцца літаратурныя чытанні "Бешчаўская вішня", конкурс мастакоў і кулінараў "Вішнёвая фантазія", конкурс прыпевак "Зноў вішня заквітнее", святы "Вішнёвая сімфонія" і "Вішнёвае варэнне".

Пад час фэсту працуюць цікавыя выставы, на якіх госці знаёмяцца з "ягаднай" творчасцю. Фотаздымкі і карціны на вішнёвую тэму ўдзельнікі дасылаюць нават з Вялікабрытаніі, Германіі, Іспаніі, Турцыі.

А на фестывальнай сцэне пад адкрытым небам выступаюць фальклорныя калектывы. Сёлета сярод іх быў і ансамбль беларускай песні тальяцінскіх беларусаў "Купалінка". "Бачна было, што выступленне калектыву спадабалася гледачам, зацікавіла іх, — гаворыць старшыня нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў у Тальяці "Нёман" Людміла Дзёміна. — Бо не кожны ж дзень расіяне чуюць народныя і сучасныя беларускія песні, мову, знаёмяцца з нацыянальнымі касцюмамі суседзяў".

Канешне ж, усіх удзельнікаў свята вясковыя кулінары частуюць вішнёвымі пірагамі. Паспрабавалі салодкі пачастунак і госці з Тальяці. "Смак сакавітай спелай ягады, намаляваныя вішанькі на шчоках дзяцей і дарослых, гасцінасць гаспадароў, сувеніры з бяросты ад мясцовых умельцаў — усё гэта надоўга застанецца ў памяці", — прызнаецца Людміла Дзёміна.

Беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія "Нёман" гарадской акругі Тальяці
Расія, Самарская вобл. г. Тальяці.
Кіраўнік Дзёміна Людміла Іванаўна
e-mail: neman-volga@mail.ru

ПОКЛІЧ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

"Мне ёсць куды вяртацца..."

Шаноўная рэдакцыя! Я даўно, больш за сорак гадоў жыву ў Расіі, і калі атрымаў прапанову ад вас расказаць пра тое, што грэе мяне ў Беларусі, то і разгубіўся крыху. Бо і ў краі дзяцінства шмат дарагіх мне людзей, і ў Гомелі, і ў Мінску — повязь з Бацькаўшчынай адчуваю заўсёды. І яна ніколі не парывалася.

На пачатку пра сябе. Нарадзіўся я ў пасляваенным 46-м, і зусім нядаўна, восьмага жніўня, мне ўжо споўнілася 65 гадоў. Многія мае калегі-геолагі, супрацоўнікі Усерасійскага навукова-даследчага інстытута гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі, дырэктарам якога я цяпер з'яўляюся, ведаюць: Крупадзераў родам з Беларусі. А ведаюць, дарэчы, і таму, што я — патрыёт сваёй Айчыны, заўсёды аказваюся "на беларускім баку" ў розных спрэчках. І дадому, на Гомельшчыну, звычайна прыязджаю разы два на год: як правіла, на Радаўніцу і пад час адпачынку ў жніўні. Хоць розных спраў, вядома ж, заўсёды шмат. Сам я цяпер доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар геалагічнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава, акадэмік Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук.

Родныя з Беларусі заўсёды рады "маскоўскаму госцю", сустрэчы нашы — цёплыя і сардэчныя. У Гомелі жыве родная сястра мая, Тамара Сцяпанаўна. Там жа, у горадзе над родным мне Сожам, дзе я пасля заканчэння школы ў 1964-65 гадах працаваў рабочым у рачным порце, сёння будуюць сваё жыццё стрыечныя браты і сёстры, іх дзеці. Ёсць радня і ў вёсцы Кунтараўка Веткаўскага раёна, адкуль я родам. Запрашаюць да сябе і многія сябры-геолагі з Мінска, у ліку якіх Уладзімір Уладзіміравіч Карпук, Уладзімір Дзмітрыевіч Коркін, Георгій Іванавіч Ількевіч...

Бываючы на Радзіме, абавязкова наведваю магілы бацькоў. На наступны год, дарэчы, будзе сто гадоў, як у вёсцы Радуга Веткаўскага раёна нарадзіўся мой тата, Сцяпан Фёдаравіч. Яго не стала ў 1993-м. А маме, Марыі Ільінічне, у дзявоцтве Лебедзевай, сёлета магло б быць 90: яна памерла дзесяць гадоў таму. Яе, упэўнены, ведалі ўсе ў акрузе: мама працавала педагогам, загадвала дзіцячым садам торфазавода, пакінула па сабе добрую памяць. Сам жа я з 1953-га па 1964 год вучыўся, і даволі паспяхова, у сярэдняй школе торфазавода "Бальшавік": закончыў яе з сярэбраным медалём. Адразу, аднак, стаць студэнтам не атрымалася, і я паспрабаваў нялёгкага "партовага" хлеба. І ўжо ў 1965-м паступіў на геалагічны факультэт Маскоўскага дзяржуніверсітэта, закончыў яго з адзнакай ды так і застаўся ў Расіі надоўга.

Цёплая сустрэча на Радзіме з сёстрамі і пляменнікам

Мне заўсёды цікава, што адбываецца ў Беларусі, найперш у беларускай геалагічнай навуцы. Вось і сёлетняй вясной, калі наш інстытут праводзіў чарговую міжнародную навукова-практычную канферэнцыю, мы запрасілі паўдзельнічаць у ёй і з радасцю прымалі дэлегацыю беларускіх вучоных на чале з патомным геолагам, акадэмікам Анатолем Аляксандравічам Махначом.

У маім рабочым кабінеце сярод камянёў, узораў геалагічных парод з розных месцаў ёсць і такія рэчы, што нагадваюць пра Беларусь. У прыватнасці, вялізная кніга "Нацыянальны атлас Беларусі" на беларускай мове — падарунак ад аўтарскага калектыву. Дарэчы, такім фундаментальным, багата ілюстраваным навукова-даведачным і картаграфічным выданнем, якое пабачыла свет у 2002 годзе, беларусам можна ганарыцца! Ёсць і невялічкія, але вельмі дарагія для мяне зборнікі вершаў майго пляменніка з Гомеля Максіма Арлова — у хлопца цудоўныя вершы, і я ўсяляк падтрымліваю яго ў паэтычнай творчасці. Нагадвае мне пра Беларусь і партрэт Герасіма Васільевіча Багамолава — ён быў акадэмікам АН Беларусі, а таксама першаадкрывальнікам Старобінскага радовішча калійных соляў у Беларусі.

Уладзімір Крупадзераў,
ураджэнец Веткаўскага раёна, доктар геолага-мінералагічных навук

Даведка "ГР". Уладзімір Сцяпанавіч Крупадзераў — вядомы ў Расіі і за яе межамі навуковец у галіне інжынернай геалогіі. Аўтар звыш 170 апублікаваных прац. Пастаянны ўдзельнік і кіраўнік навукова-даследчых і геолага-разведачных работ, якія праводзяцца геалагічнай службай Расіі. Пад яго кіраўніцтвам, з актыўным удзелам выдадзена ўнікальная "Карта экзагенных геалагічных працэсаў Расіі", аналагаў якой няма ў свеце. Наш зямляк абгрунтаваў і выдзеліў новы, самастойны кірунак у інжынернай геадынаміцы — вучэнне пра рэжым экзагенных геапрацэсаў. На пачатку 1980-х сумесна з беларускімі геолагамі ўдзельнічаў у навукова-даследчых, у тым ліку палявых работах на тэрыторыі Беларусі.

ДАРОГІ І ЛЁСЫ

Ашмяншчына: шляхі турыстычныя

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Часта і святыні іх стаялі побач, на адной і той жа плошчы, як у Ашмянах, — і ніякай варажнечы! Такое, наколькі я ведаю, здзіўляе зарубежных турыстаў і сёння. А вось тут, на карце, бачна, як Віленскі шлях, стары і новы, скрыжоўваецца з традыцыйнымі "трактамі" на поўдзень і поўнач — праз Гальшаны на Ліду і Гродна, а таксама праз Астравец на Полацк.

Гэта цікавае скрыжаванне, перспектыўнае для развіцця турызму, пагаджаецца Іосіф Цімкоўскі. Дарэчы, і выбраўся ён у дарогу, жадаючы прыгледзець якую гістарычную сядзібу для такой мэты, звязаную з нейкай знакавай асобай. Пытаецца, што б я мог параіць? Можа, кажу, падыдзе сядзіба, звязаная з лёсам Зыгмунта Мінэйкі, удзельніка паўстання 1863 года? Ён стаў палітсыльным, а потым і нацыянальным героем Грэцыі, аўтар кнігі "З тайгі пад Акропаль". Гэта яго прамы праўнук Георгіас Папандрэу ўзначальвае ўрад Грэцыі ў няпросты для краіны час. Нарадзіўся ж Мінэйка непадалёк, у Балванішках, перайменаваных пазней у Зялёны Бор. Вырашаем у райвыканкаме пацікавіцца, ці ацалела тая шляхецкая сядзіба.

У Ашмянскім райвыканкаме нас сустракае Валянціна Лузіна, разам з ёй ідзем да старшыні Юрыя Адамчыка.

— Пра вас, Юрый Уладзіміравіч, многа добрага казалі на адным з пасяджэнняў музейнай секцыі Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў, куды я маю гонар уваходзіць, — пачынаю гаворку з гаспадаром кабінета. — Згадваліся і поспехі ў спалучэнні дзяржаўнага і прыватнага прадпрымальніцтва для эканамічнага і культурнага развіцця рэгіёна, і што гэта станоўча ўплывае на развіццё ў раёне музейнай і турыстычнай справы. Якія прыклады, на вашу думку, найбольш яскравыя?

— Вядома ж, разам дзяржаўны і прыватны бізнес працуюць найбольш эфектыўна, і няма сэнсу доўга расказваць пра плюсы такога спалучэння, — усміхнуўся старшыня. — Вось кніжка з маёй прадмовай, прыкладаў шмат, можаце скарыстаць...

Пад час размовы Юрый Адамчык параіў нам абавязкова пабываць на Ашмянскім мясакамбінаце, брэнд якога добра вядомы і ў Беларусі, і ў замежжы. Камбінат атрымаў еўрапейскі экалагічны сертыфікат, на лагатыпе прадпрыемства ёсць словы "З павагай да якасці!" Што да турызму, то, нагадаў, у раёне сыходзяцца шляхі не толькі беларускія, але і еўрапейскія — гасцей прымаюць Ашмяны, Мураваная Ашмянка, Гальшаны і Баруны, раённы гістарычна-краязнаўчы музей імя Багушэвіча, музеі ў Жупранах, каля магілы паэта, і ў Гародніках, ля помніка прафесару Снядэцкаму. Ведаючы, што хутка праз Ашмяны і Гальшаны пройдзе беларуска-польска-літоўскі маршрут "Абарончыя храмы і цудатворныя іконы", я запытаў, ці знойдзецца ў раёне турыстам добрае харчаванне і начлег. Старшыня райвыканкама ўдакладніў: усё ідзе па плане. Дзяржаўныя і прыватныя кавярні ёсць не толькі ў Ашмянах, але і ўздоўж дарог, у буйнейшых вёсках. Ёсць гасцініца і ў Гальшанах: там усё часцей бываюць на святах і ў багатым школьным музеі замежныя госці. А ў вёсцы Грынцы, у конна-спартыўным цэнтры "Гіпіка" можна пакатацца на конях, паласавацца стравамі з нацыянальнай кухні, камфортна пераначаваць. Дарэчы, гэты асяродак названы ў гонар мясцовага, з Мураванай Ашмянкі, магната і мецэната Дарагастайскага, які заснаваў там уласную друкарню і выдаў кнігу пад той жа назвай — пра анатомію і фізіялогію коней.

Пацікавіліся мы і станам сядзібы Мінэйкаў у колішніх Балванішках. "На жаль, ад яе нічога не застало-ся, нават фундамента", — адказаў Ю. Адамчык. Я бачыў, як крыху разгубіўся Іосіф Цімкоўскі. Што ж, многія сядзібы напаткаў такі лёс... І я параіў Іосіфу Барысавічу заглянуць яшчэ ў Дубнікі, у суседні Астравецкі раён. Там таксама ёсць сядзіба Мінэйкаў, куды прыязджаў іх блізкі родзіч Зыгмунт, там працаваў над сваёй трылогіяй Генрык Сянкевіч.

Забягаючы наперад, скажу: наш візіт у Дубнікі пакуль не даў выніку. Сапраўды, гістарычная сядзіба, пабудаваная ў пецярбургскім стылі ў пазамінулым стагоддзі, пасля перасялення адтуль дома для састарэлых пустуе. І таму прадаецца. Але ці стане Іосіф Цімкоўскі яе гаспадаром?

А ў райвыканкаме на заканчэнне сустрэчы я як сябар рады выдавецтва "Кнігазбор" падарыў Валянціне Міхайлаўне і Юрыю Уладзіміравічу кнігі з выбранымі творамі Вінцука Адважнага (Язэпа Германовіча) — святара, пісьменніка і грамадскага дзеяча беларускай дыяспары ў Англіі. Нарадзіўся ён у Гальшанах, пахаваны на могілках святога Панкраца ў Лондане. Вельмі цікавы быў празаік, апісаў свой жыццёвы шлях ва ўспамінах "Кітай — Сібір — Масква", дзе расказаў пра нягоды не з горыччу, а з гумарам. Выступаў у гады "халоднай вайны" ў лонданскім часопісе "Божым шляхам" супраць прымянення атамнай зброі, што неадназначна было ўспрынята эміграцыяй. Мы сышліся на думцы, што такая кніга абавязкова павінна быць і ў бібліятэках, і ў храмах Ашмяншчыны.

БЕЛТА
Ля сцен Гальшанскага замка ажываюць лепшыя пачуцці

БЕЛТА
На цэнтральнай плошчы ў Ашмянах суладна высяцца побач праваслаўная царква і каталіцкі касцёл

Сведка даўніх дзён

У рацэ Дрысе знайшлі ўнікальную скульптуру

Віктар Корбут

Гэта незвычайная мясціна. З даўніх часоў тут суіснавалі плямёны крывічоў і латгальцаў. Таму цяжка сказаць, якому з іх належаў ідал, які паднялі ў жніўні дайверы з дна ракі Дрыса, што ў Расонскім раёне Віцебшчыны. Адназначна адно — яго стварылі продкі беларусаў, цяперашніх жыхароў краю. Драўляная фігура невядомага боства цяпер знаходзіцца ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Навукоўцам яшчэ трэба вывучыць, колькі год дубу, з якога вычасана статуя, колькі яна ляжала ў вадзе — каб хоць прыкладна ведаць час стварэння незвычайнага артэфакта.

З дна Дрысы ідал паднялі мінскія дайверы, а сачыў за іх работай Дзяніс Дук, навуковец з Полацкага ўніверсітэта. Калі ідал сапраўдны, то, мяркуе гісторык, ён існаваў і ў часы хрысціянізацыі Полацкай зямлі: "Яна праходзіла вельмі складана, бо тут доўга трымаліся рэлікты паганскіх вераванняў. І калі людзі перасталі пакланяцца ідалу — яшчэ давядзецца высветліць".

Спадар Дук адзначыў, што ідал унікальны, бо захаваўся цэлы: "Яго, мабыць, скінулі ў раку пасля таго, як у гэтых мясцінах прынялі хрысціянства. І на сённяшні дзень гэта адзіная такая знаходка не толькі для Беларусі, але і для суседніх краін".

Скульптура невядомага боства ў вышыню дасягае амаль паўтара метра. Калі яго дасталі з вады, ідал важыў больш за 150 кілаграмаў.

Рэдкая рэч будзе захоўвацца ў музеі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Вольга Ляўко, загадчык інстытуцкага цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства, плануе ўсталяваць статую ў адной з залаў музея. Але найперш яго чакае кансервацыя. Спадарыня Ляўко расказала, што ўжо дамовілася са спецыялістамі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, якія зоймуцца кансервацыяй дрэва: "Яны распрацоўвалі спецыяльную праграму кансервавання для музея "Бярэсце" ў Брэсце, дзе вуліцу XIII стагоддзя (драўляныя дамы, мастаўю) захоўваюць ужо амаль 30 гадоў".

Дайверы са сваёй знаходкай

Калі спатрэбіцца, то Інстытут гісторыі гатовы звярнуцца да замежных спецыялістаў па кансервацыі драўляных вырабаў. Тым часам Максім Ярмохін, дэндрахранолаг з Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН, плануе вызначыць век дубу, з якога вычасаны ідал, радыевуглярodным метадам.

У планах археолагаў — вывучыць прылеглую да месца знаходкі ідала тэрыторыю, каб высветліць, ці захаваліся там сляды капішча, дзе стаяла статуя боства.

Даведка "ГР". Дагэтуль у Беларусі трапляліся толькі каменныя выявы паганскіх бостваў. Аднак і гэтыя знаходкі — вельмі рэдкія.

Дрэс-код для першакласніка

Сёння ў школах краіны ўжо не ўбачыш дзяўчынак у аднолькавых сукенках, як гэта было гадоў дваццаць таму, і хлопчыкаў — у аднатыпных касцюмах. Цяпер нават вучні малодшых класаў імкнуцца да адметнасці. Тым не менш школьная супольнасць выбрала акрэслены напрамак моды — дзелавы стыль.

БЕЛТА

Дзелавы стыль вучням даспадобы

Кацярына Мядзведская

У канцы жніўня школьны гандаль прыкметна ажывае. Вярнуліся з летнікаў і вёсак дзеці, а з імі прыйшлі клопаты бацькоў пра школу. Сёлета, як заўсёды, па ўсёй краіне працавалі кірмашы, на якіх можна было, вобразна кажучы, цалкам сабраць школьны ранец. На адным з такіх "базараў" пабывала і я.

Зайшоўшы ў мінскі выставачны цэнтр "Белэкспа", дзе праходзіў кірмаш "Прывітанне, школа!", нават разгубілася — столькі там разнастайных пісьмовых прыналежнасцяў, сшыткаў, падручнікаў. І ўсё падавалася такім яскравым — на любы густ, адным словам.

Шмат наведвальнікаў было ля стэндаў швейных фабрык "Калінка", "Славянка", "Камінтэрн", "Белкрэда" — менавіта там шыецца фірменнае адзенне для школьнікаў. Заўважыла, што сёлета больш пашанцавала дзяўчынкам. Для іх — мноства прыгожых і вельмі зручных строяў. Не дзіўна, што разгубілася маладыя бацькі Ірына і Віталь Качанавы, калі куплялі адзенне для дачкі-першакласніцы Карыны. "Ніяк не маглі выбраць паміж сарафанам і касцюмам, — прызнаецца Ірына. — Урэшце вырашылі ўзяць і тое, і другое". Строгі выгляд школьнага адзення бацькі ўхваляюць — маўляў, хай прывыкае дзяўчынка да дзелавога стылю, у школе ж трэба думаць найперш пра вучобу. Пра тое, што на ўроках не да месца джынсы, гаварылі мне і дзесяцікласніцы Маша Казлова і Лера Сіняўская з 23-й мінскай гімназіі. Дзяўчаты выбралі сабе класічныя касцюмы.

Усяго ж, як мне паведаміў намеснік старшыні канцэрна "Беллегпрам" Уладзімір Астроўскі, сёлета было распрацавана амаль паўтары сотні мадэляў адзення для вучняў. Для дзяўчынак — больш за пяцьдзясят строяў, для хлопчыкаў — больш за сорак.

Пагадзіцеся, ёсць з чаго выбраць, каб мець адметны выгляд. Дарэчы, упершыню былі распрацаваны і мадэлі дзелавых касцюмаў з вельвету. Парадавалі і тканіны, з якіх пашыта адзенне. На этыкетках прачытала: шэрсць, бавоўна, шоўк, віскоза. А значыць, мінімум сінтэтыкі. І максімум камфорту, які вельмі патрэбен школьнікам пад час падарожжаў па Краіне ведаў.

ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

У оперы "Аіда" на Беларусі — свая цікавая гісторыя

Сёння і ўчора аднаго спектакля

Выстава гісторыі пастаноўкі "Царства Аіды" адкрылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры

Выстава — сумесны праект музея і тэатра. На ёй прадстаўлены фатаграфіі акцёраў, якія былі заняты ў ролях у розныя гады, здымкі сцэн са спектакляў, пачынаючы з 1953 года і заканчваючы 2011-м. Як адзначыла вядучы рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Вольга Савіцкая, асаблівае месца ў экспазіцыі займаюць унікальныя эскізы касцюмаў Сяргея Нікалаева з фондаў музея, а таксама і самі касцюмы.

Першая пастаноўка "Аіды" ў Мінску была падрыхтавана ў 1953 годзе. Спектакль паставіла знакамітая спявачка і оперны рэжысёр Ларыса Александроўская, і ён паспяхова ішоў больш за пяцьдзясят гадоў. Афішы спектакля ў розныя гады ўпрыгожвалі імёны Соф'і Друкер і Мікалая Ворвулева, Марыі Гулегінай і Міхаіла Дружыны, Святланы Данілюк і Людмілы Шамчук, Зіновія Бабія, Анатоля Генералава, Міхаіла Галкоўскага, Віктара Чарнабаева, Нагімы Галеевай. Гледачоў прыцягвалі як маштабнасць спектакля, так і яго выдатнае мастацкае афармленне.

У тым жа 1953 годзе адбылася яшчэ адна выдатная пастаноўка оперы — у Бухарэсце. Мастацкае афармленне (сцэнаграфія і касцюмы) гэтай оперы належаць народнаму мастаку Беларусі, заслужанаму дзеячу мастацтваў Расіі, Літвы, Таджыкістана Яўгену Чамадураву.

Над новым спектаклем, прэм'ера якога адбылася ў маі 2011 года, працаваў рэжысёр-пастаноўшчык Міхаіл Панджавідзе. Ён адразу вырашыў: спектакль трэба рабіць у дэкарацыях Яўгена Чамадурава. "Была праведзена вялікая работа па пошуку матэрыялаў і рэстаўрацыі, ездзілі ў Казань, звязваліся з фондам Чамадурава. Збіралі інфармацыю па тых нешматлікіх эскізах, буклетах, дэкарацыях, што захаваліся ад знакамітага мастака", — адзначыў Міхаіл Панджавідзе.

СВЯТА

Добрыя жарты Аляксандра Каршакевіча

Майстар сяброўскіх шаржаў з альманаха "Вожык" на Дні беларускага пісьменства ў Ганцавічах будзе раздаваць незвычайныя аўтографы

Іван Ждановіч

У Смаргоні, два гады таму, на свяце Слова ў яго раптам прарэзаўся талент бліц-шаржыста. "Былі "вожыкаўцы" ў гушчыні народу, і калегі папрасілі: Саша, памалюй шаржы.., — згадвае Аляксандр. — Не ўсе тут жа кінуліся "маляваца": беларусы ж асцярожныя, спачатку баяліся падвоху... Але ж мы — зладжаная каманда, і сябры стваралі вакол "студыі" цудоўную, добразычлівую атмасферу. Юлія Францаўна Зарэцкая, галоўны рэдактар, усмешкай заваблівала смаргонцаў і гасцей свята ў наша кола, Павел Паўлавіч Саковіч дасціпным слоўцам падбадзёрваў, а я — алоўкам працаваў. Першых шаржаў пяць рабіў старанна, а потым бачу: людцы мае, народ паваліў! Пагалоска пайшла, бягуць з усіх канцоў: і мяне намалюй! Чарга ўтварылася. Ну я і перайшоў на бліцы. Дэталь у твары схапіў, яшчэ два-тры штрыхі — і наступны. Як на канвееры гадзіны дзве працаваў, аж спіна ўзмакрэла".

Шарж на самога сябе

Што добрую згадку пра свята атрымалі дзясяткі людзей — гэта адно. Але ж і падпісак на "Вожык" з рэгіёна пабольшала, бо пад сяброўскімі шаржамі мастак пакідаў два знакавыя словы: "Каршакевіч. Вожык". Як аўтограф на памяць. А яшчэ, дадаюць калегі па выданні, людзі былі ў вялікім захапленні ад таго, як віртуозна ён працуе. Чысты ліст паперы, звычайны аловак... Але погляд мастака "сканіруе" натуру — і тут жа, на вачах, творыцца шарж. Казалі: во гэта майстар! Во штукар!

Вядома ж, адметнае майстэрства шліфавалася доўгі час. Аляксандр амаль трыццаць гадоў таму прыйшоў у слаўны сваімі традыцыямі, талентамі рэспубліканскі часопіс сатыры і гумару "Вожык". Цяга да малявання ў яго з маленства, набываў вопыт і пад час вучобы ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя Глебава. Цяпер ён — адзін з вядучых карыкатурыстаў краіны, ілюструе і розныя дзіцячыя выданні. У гутарцы са мной зазначыў, што гатовы да творчых кантактаў з беларусамі замежжа. "Мы, "вожыкаўцы", адкрыты да супрацоўніцтва, а гумар, як вядома, межаў не мае, асабліва "маляваны", — разважае Аляксандр. — Запросяць нас суайчыннікі на свае святы, імпрэзы — абавязкова адгукнемся, прывязем ім добры настрой з нацыянальным каларытам". Малюнкі мастака друкаваліся на Кубе, у Польшчы і ў многіх іншых краінах. Сёлета і выстава Аляксандра Каршакевіча "Карыкатура = Журналістыка + Мастацтва" — амаль 200 работ! — з поспехам прайшла ў Міністэрстве інфармацыі. Аўтар прадстаўляў шаржы на вядомых пісьменнікаў, мастакоў, дзеячаў культуры на выставе "СМІ ў Беларусі", ладзілася вялікая выстава і ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Юлія Зарэцкая

Цяпер Аляксандр Каршакевіч, яго паплечнікі з "Вожыка" на ніве сатыры і гумару Юлія Зарэцкая, Павел Саковіч ужо гатовы да сустрэч на ганцавіцкай зямлі. "На месцы" яны разгорнуць невялічкую экспазіцыю, каб прэзентаваць альманах-юбіляр "Вожык" (якому сёлета — 70 гадоў), і далучацца да сяброўскай бяседы са сваімі вершамі, жартамі, эпіграмамі, гумарэскамі. І абавязкова зноў будуць сяброўскія шаржы-аўтографы ад Аляксандра Каршакевіча — на добры настрой і доўгі ўспамін.

Уладзімір Правасуд

Янка Сіпакоў

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў

Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

E—mail: golas_radzimy@tut.by

Аб'ём выдання: 1 друк. арк.

Тыраж: 1945, **Заказ:** 903

Час падпісання ў друк: 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». *ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск*

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2011